УДК 378.147:7(476)

# МАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ: ПРАБЛЕМЫ І ШЛЯХІ РЭАЛІЗАЦЫІ

***Т. І. Васюк,***
*дацэнт, дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжаны агульныя праблемы мастацкай адукацыі і шляхі іх рэалізацыі на практыцы. У якасці прыклада аналізуецца педагагічная і мастацкая дзейнасць мастака-педагога, заслужанага настаўніка, члена Беларускага саюза мастакоў Валянціна Пятровіча Пакаташкіна, які за 50 гадоў працы ў Гомельскім Палацы піянераў (цяпер установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі») выхаваў больш за 1000 навучэнцаў мастацкага профілю. Адзначана, што роля асобы педагога, асабліва ў выхаванні творчай моладзі, мае вельмі вялікае значэнне ў плане накірунку яе мастацкай дзейнасці. Высокі ўзровень выкладання спецыяльных прадметаў, такіх як малюнак, жывапіс і кампазіцыя, вырашае далейшы накірунак развіцця падрастаючага пакалення мастакоў.

**Ключавыя словы:** творчасць, методыка, сістэма, настаўнік, малюнак акадэмічны, жывапіс, дэкаратыўнае мастацтва, кампазіцыя.

# ART EDUCATION: PROBLEMS AND WAYS OF IMPLEMENTATION

***T. Vasyuk,***
*Associate Professor, Associate Professor of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article discusses the general problems of art education and the ways of their implementation in practice. As an example, we can cite the pedagogical and artistic activities of the artist-teacher, honored teacher, member of the Belarusian Union of Artists V. Pakatashkin. Over 50 years of work at the Gomel Palace of Pioneers (now the educational institution «Gomel State Regional Palace of Children and Youth Creativity»), he trained more than 1000 art students. The author notes that the role of the teacher's personality, especially in the education of creative youth, is very important from the point of view of the direction of their artistic activity. The high level of teaching of special subjects

such as drawing, painting and composition determines the future direction of the younger generation of artists.
**Keywords:** creativity, methodology, system, teacher, academic drawing, painting, decorative art, composition.

У Беларусі мастацкая адукацыя спрадвеку існавала ў адпаведнасці з гістарычным развіццём заходняй цывілізацыі. У цяперашні час мастацкая адукацыя ў рэспубліцы мае разнастайныя формы. Праблемы захавання народных традыцый і акадэмічнай навізны ў сістэме адукацыі на тэрыторыі Беларусі вырашаюцца сінтэтычна.

Адзначым, што пытанні музычнай і выяўленчай адукацыі падрабязна разгледзела прафесар, доктар мастацтвазнаўства Вера Паўлаўна Пракапцова. Яе навуковыя артыкулы і манаграфіі пабудаваны на выверанных даследаваннях аб цікавых творчых працэсах, якія зарадзіліся ў старадаўнія часы. Напрыклад, на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. існавала традыцыйная і «панская педагогіка» ў музыцы і выяўленчым мастацтве (менавіта гэта грунтоўна даследвала В. П. Пракапцова). Напачатку XX ст. адбыліся значныя змены ў мастацкай адукацыі. Моцны ўплыў замежжа на класічную культуру славян меў поспех, але ў 1920-я гг. адбываюцца пераўтварэнні з аднаўленнем лепшых традыцый мастацкай адукацыі. У гэты час узнікае яснае разуменне глыбіні ведаў і майстэрства ў напрамку народных рамёстваў, якія зарадзіліся на аснове традыцый Беларусі. Трэба дапоўніць, што ў наш час методыка выкладання мастацтва складаецца з сінтэзу навуковых сістэм аб дзейнасці мастацкіх школ і напрамкаў, дзейнасці мастака як творцы. Спецыфіка выкладання спецыяльных прадметаў закладзена ў шэрагу дзяржаўных пастаноў і дакументаў, але час патрабуе трансфармацыі асобных суадносін у традыцыйных і наватарскіх формах мастацкай адукацыі. Напрыклад, у адной з вядучых творчых устаноў адукацыі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, вырашаюцца задачы сінтэзу багатых акадэмічных традыцый з народнымі ведамі на генетычным узроўні.

Такім чынам, адукацыйныя стандарты пры навучанні на творчых спецыяльнасцях па асобных дысцыплінах мастацкага профілю склаліся ў XX ст., а старажытная народная і класічная педагогіка маюць шматвекавыя асновы мастацкай адукацыі па малюнку, жывапісу, кампазіцыі і іншых спецыяльных прадметах. Напрыклад, у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (у ткацтве слуцкіх паясоў, вырабе керамічных кафляў) адбывалася дыферэнцыяцыя этапаў працы. Аўтар і выканаўца выконвалі розныя віды працы па адной тэме. Мастакі і сёння выкарыстоўваюць сістэму працы знакамітага майстра Сцяпана Полубеса, які у XVII ст. аздобіў саборы Маскоўскага Крэмля керамічнымі рэльефамі і арнаментальнымі ўзорамі. Цікавая асоба майстра выхавала шэраг падмайстэрыяў высокага ўзроўню. Ніжэй будзе раз-

гледжана падобная ў мастацкай адукацыі з'ява на прыкладзе педагагічнай і творчай дзейнасці мастака і педагога з Гомеля Валянціна Пятровіча Пакаташкіна (1940–2022).

Мастацкая адукацыя з'яўляецца асновай жыцця знакамітага мастака, заслужанага настаўніка В. П. Пакаташкіна. Энцыклапедычныя даведнікі маюць сціплыя звесткі аб яго творчай і педагагічнай дзейнасці. Аднак яго асоба – добры прыклад самаадданай працы і незвычайнага таленту бачыць у кожным сваім вучні часцінку сонейка, радасці вялікіх магчымасцяў.

В. П. Пакаташкін нарадзіўся ў 1940 г. у раёне Навабеліцы (зараз раён г. Гомеля). Там жа нарадзіліся вядомыя мастакі-жывапісцы Я. Я. Маісеенка і Г. Р. Ніскі, якія сталі народнымі мастакамі Расіі. Недалёка ад Гомеля нарадзіўся і народны мастак Беларусі В. К. Цвірка, які высока цаніў талент жывапісца В. П. Пакаташкіна. Дарэчы, В. П. Пакаташкін скончыў Мінскае мастацкае вучылішча ў 1963 г., Віцебскі педагагічны інстытут (мастацка-графічны факультэт) у 1974 г. Заслужаны настаўнік БССР (1980), член Беларускага саюза мастакоў з 1994 г. Асноўныя жывапісныя творы: «На Поўначы Далёкай», «Паўночная бухта», «Пасля вучэнняў», «Гомельская ТЭЦ» і інш. [1].

У самым пачатку жыццёвага шляху творчая асоба маладога мастака яшчэ не мае пэўнага кірунка дзейнасці. Таму стандарты ў адукацыйнай творчай сістэме не з'яўляюцца асноўнай формай адукацыі ў розных відах мастацкай творчасці: у малюнку, жывапісу, кампазіцыі і інш. Своеасаблівы творчы агонь кіраўніка студыі выяўленчага мастацтва пры Гомельскім Палацы піянераў В. П. Пакаташкіна мог вызначыць патаемныя рэзервы кожнага студыйца.

Методыка выкладання малюнку ў В. П. Пакаташкіна мела класічную форму і аўтарскі змест. Кожнае заданне для навучэнцаў пачыналася з накідаў, з эмацыянальных кароткатэрміновых замалёвак. У жывапісу Валянцін Пятровіч асаблівую ўвагу надаваў святлу і цені, вызначэнню кампазіцыі ў фармаце, каларыту.

Калі малюнак і жывапіс маюць задачу на набыццё майстэрства, то кампазіцыя найбольш яскрава вызначае творчыя задачы, якія залежаць ад асабістага бачання сусвету кожным юным мастаком. Напрыклад, аб тым, як Валянцін Пакаташкін і яго старэйшы брат Яўген паспяхова вучыліся ў Мінскім мастацкім вучылішчы, памятаюць і сёння. Іх акадэмічныя працы недасягальны па майстэрству і ў нашы дні. Трэба сказаць, што браты Пакаташкіны раслі без бацькі, які загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Ім дапамог узняцца дзед па матчынай лініі, які навучыў хлопцаў усё рабіць дасканала і добра. Многія выпрабаванні загартавалі братоў, дзякуючы чаму яны сталі прафесіяналамі ў мастацкай справе. Пасля службы ў войску ў 1962 г. В. П. Пакаташкін трапіў на працу ў Гомельскі Палац піянераў на пасаду кіраўніка студыі выяўленчага мастацтва. У цяперашні час студыя

названа ў яго гонар – за 60 гадоў педагагічнай працы В. П. Пакаташкін выдаў пуцёўку ў мастацкае жыццё звыш 1000 выхаванцам. Напрыклад, у 1968 г. старэйшая, сярэдняя і малодшая ўзроставыя групы навучэнцаў студыі складаліся прыблізна з 60–70 чалавек.

Педагагічнае майстэрства В. П. Пакаташкіна вызначаецца высокім узроўнем, які адзначаны многімі дзяржаўнымі ўзнагародамі, атрыманымі як ім самім як педагогам і творцай, так і яго вучнямі. Аўтар артыкула нарадзілася пад Гомелем. Яе Валянцін Пятровіч падрыхтаваў да паступлення ў Мінскае мастацкае вучылішча за сем сустрэч, якія грунтаваліся на самастойных творчых заданнях па малюнку, жывапісу і кампазіцыі. Пасля першых заняткаў з выкладчыкам творчыя працы 15-гадовай дзяўчынкі «Восеньскі сад», «Дзед», «Старая груша» выстаўляліcь на буйных абласных выставах дзіцячай творчасці. Адзначым, што той магутны пасыл майстра, які меў мастак і педагог у адной асобе, і сёння дае моц і сілу яго вучням. Напрыклад, у 2005 г. Т. І. Васюк атрымала Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў творчасці і выхаванне творчай моладзі. А яго былы вучань Ф. П. Поўны атрымаў мастацкую адукацыю на кафедры інтэр'еру тэатральна-мастацкага інстытута (зараз Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Цяпер Ф. П. Поўны пратаірэй, дзейнасць святара Праваслаўнай царквы ён паспяхова сумяшчае з мастацкай, пры гэтым штодзень моліцца за ўсіх творцаў. Дарэчы, айцец Ф. П. Поўны стаў лаўрэатам Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За Духоўнае Адраджэнне» (2003), а таксама Прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва (2016).

У Беларусі існуюць добрыя стандарты і дакументы па мастацкай адукацыі, у т. л. па малюнку, жывапісу і кампазіцыі. Але методыка не працуе ў руках раўнадушных людзей. У XXI ст. адбыліся змены ўстойлівай сістэмы айчыннай мастацкай адукацыі на эксперыментальныя крокі ў Балонскую сістэму, аднак сёння многія праблемы ў мастацкай педагогіцы не маюць рашэнне.

На беларускай зямлі заўсёды было нямала таленавітых майстроў мастацтваў і педагогаў. Унікальны дар В. П. Пакаташкіна спалучае класічную педагогіку і мастацкую творчую дзейнасць. На сваёй юбілейнай выставе ў г. Гомеле, прымеркаванай да 80-годдзя (2020), мастак паказаў гледачам шэраг краявідаў з тонкім адчуваннем каларыту, колеру і кампазіцыйнай пабудовы. У 2022 г. Валянцін Пятровіч хацеў напісаць «Ліловы краявід з бабіным летам», але не паспеў, майстра не стала.

*1.* Покаташкин Валентин Петрович [Электронный ресурс] // Артхив: соц. сеть вокруг искусства. – Режим доступа: https://artchive.ru/artists/57645-Valentin_Petrovich_Pokatashkin. – Дата доступа: 07.09.2023.